УДК 882. 6. 09 (091) (075.8)

**А. І. Белая**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# ПРАДМЕТНА-РЭЧЫЎНЫ СВЕТ У МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ, ПАЭТЫКА, ТЫПАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ)

Даследуецца праблема канцэптуальнасці прадметна-рэчыўных дэталяў у творах мастацкай літаратуры. Рэч разглядаецца як сфера чалавечай рэальнасці, матэрыяльнай і эстэтычнай; кампанент культуры, маркёр і/ці стымул ускладнення духоўнага жыцця асобы, дынамікі характару. Прыёмы ўключэння прадметных рэалій і рэчываў — «эталонных матэрыялаў» — у літаратурныя творы, выкарыстаныя Ядвігіным Ш., Я. Коласам, К. Чорным, А. Мрыем, М. Гарэцкім, М. Булгакавым, А. Талстым, М. Зошчанкам, Л. Калюгам, Ч. Мілашам, А. Зегерс, узбагацілі іх мастацка-выяўленчы дыяпазон як носьбітаў разнастайных сімвалічных значэнняў, паяднаных з глыбінямі чалавечага быцця і свядомасці. У артыкуле інтэрпрэтуецца сімволіка фарфору (парцаляны) як сталага элемента шэрагу культурных мадэляў.

**Ключавыя словы:** эстэтычная рэальнасць, прадметна-рэчавы свет, вобразы часу, «эталонныя матэрыялы», канцэпцыя асобы, сімволіка фарфору (парцаляны), культурная ідэнтыфікацыя, гуманістычныя каштоўнасці.

**Уводзіны.** Літаратура эстэтычна асвойвае свет у мастацкім слове. Яе вечнай тэмай і прадметам з'яўляюцца чалавек, прырода і грамадства ў іх узаемадзеянні. Мастацкі свет літаратурнага твора пачуццёва дакладны і матэрыяльна насычаны. Ён складаецца з усіх прыродных стыхій, з усіх прадметаў «першай» (горы, лясы, рэкі) і «другой», рукатворнай, прыроды (будынкі, прылады, рэчы). У мастацкім свеце самыя, здавалася б, нязначныя, дробныя, пабочныя прадметна-рэчыўныя дэталі не з'яўляюцца выпадковымі. «Рэчы мастацкага свету падпарадкаваны яго ўнутранай логіцы і задачы ўздзеяння на чалавека ў патрэбным эстэтычным напрамку» [1, с. 305]. Суаднесеныя з героем, яго свядомасцю, ментальнымі працэсамі, прадметы і рэчы дапамагаюць глыбей выявіць эмацыянальна-духоўны стан асобы, яе экзістэнцыю.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыял даследавання — празаічныя і паэтычныя творы беларускай, рускай і заходнееўрапейскіх літаратур, напісаныя ў крызісныя перыяды XX стагоддзя. Выкарыстаны комплексны падыход на аснове кантэкстна-герменеўтычнага і параўнальна-тыпалагічнага. Асноўныя метады — матыўны аналіз, інтэрпрэтацыя, канцэптуальны аналіз.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Прадметна-рэчыўны свет — важнейшая сфера чалавечай рэальнасці, у тым ліку і эстэтычна пераўтворанай; гэта адна з умоў фізічнага існавання і дзейнасці людзей. Таксама рэч непасрэдна звязана са свядомасцю і паводзінамі чалавека; яна з'яўляецца кампанентам культуры, бо валодае здольнасцю пераадольваць сваю «рэчавасць» [2] і функцыянаваць у духоўнай прасторы. Рэч кімсьці зроблена, некаму належыць, выклікае да сябе пэўныя адносіны, робіцца крыніцай уражанняў, перажыванняў, роздуму. Рэчы або пастаўлены на патрэбнае месца і адпавядаюць свайму прызначэнню, або, наадварот, чамусьці знаходзяцца на зусім выпадковым месцы (як вядро на ложку ў п'есе Л. Родзевіча «П. С. Х.»).

У літаратурных творах рэчы ўтвараюць рэпрэзентатыўнае матыўна-вобразнае поле,